На Брэстчыне ўпершыню зафіксаваныя чатырохкрылыя совы

Пагалоска пра з'яўленне ў заходнім рэгіёне невідімых да гэтага часу птушак гуляла сярод мясцовых жыхароў яшчэ мінулай вясной. Аднак рэальных сведкаў тады рэдакцыя так і не адшукала. Было вядома толькі тое, што нейкая птушка, якая больш нагадвала мініяцюрны верталёт, завісае у паветры перад балконамі шматпавярховых дамоў і зазірае ў вокны... А вось сёлета карэспандэнту "Звязда" пашэнцавала, бо ў рэдакцыю звярнуўся сведка, які добра разглядзеў дзівоснага летуна і нават паказаў аматарскі здымак гэтай жывой істоты.

— У мінулую суботу на снеданне я вырашыла прыгатаваць свайму мужу бліны. — паведаміпа нам жыхарка горада Ляхавічы Брэсцкай вобласці пенсіянерка Святлана Астапава. — Першыя бліны ў мяне крыху падгарэлі, таму шырэй і адчыніла адну створку акна на кухні. Недзе праз паўгадзіны адпучылася на нейкую хвіліну ў іншы пакойчык, а калі вярнулася на кухню, то ўбачыла, як нейкая чатырохкрылая птушка з маім бліном у кіпцюрах ужо вылятае з кухні на балкон.

На жаль, больш ніхто тады з жыхароў дома па вуліцы Леніна, 45 гэтую цікавую птушку не бачыў. Аднак, як паведамілі нам жыхары з суседняй вуліцы гэтага гарадка, летась увесну ў вокны на кухні неаднойчы заляталі нейкія вяртлявыя птушкі. Цікава, што з'яўляліся яны заўсёды ў той час, калі там гатавалі бліны. Тыя птушкі былі падобныя на соў шэрага колеру з выразным тварам нібыта ў акулярах. Тады тым летунам нават мянушку далі — кугакаўка-блінаед.

Спецыяліст па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Руслан ШАЙКІН паведаміў нам, шго чатырохкрылых соў айчынныя арнітолагі пакуль не фіксавалі. Суразмоўца нагадаў нам, што менавіта 1 красавіка адзначаецца Сусветны дзень птушак. Можа менавіта на свае прафесійнае свята асобныя мудрыя совы знаходзяцца ў такім цудоўным настроі, што ў іх на кароткі час вырастаюць дадатковыя крылы.

— Калі быць больш дакладным, то ад сябе асабіста дадам, што мне добра вядома адно такое гняздоўе. Праўда, у красавіку адтуль звычайна вылятаюць шматкрылыя качкі, — удакпадніў Руслан Шайкін.

Сяргей Куркач.

Источник: Звязда.-2010.-1 кастр.-С.10.